Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# ІНАВАЦЫЙНЫ БІБЛІЯТЭЧНЫ МЕНЕДЖМЕНТ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(менеджмент)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2017

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Н. Я. Петушка*, дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Ю. М. Галкоўская*, дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*вучоны* савет дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;
*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 22.02.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 15.03.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам па бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 22.03.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказныя за выпуск: Н. Я. Петушка, Ю. М. Галкоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) для напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент).

Вучэбная дысцыпліна «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент» забяспечвае прафесійную падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў у сферы арганізацыі і эканомікі бібліятэчнай справы, садзейнічае развіццю кампетэнцый у кірунку інавацыйнага менеджменту, фарміруе веды і ўменні, неабходныя для кіравання бібліятэкай ва ўмовах павышэння іх сацыякультурнай значнасці ў грамадстве.

Актуальнасць вывучэння гэтай вучэбнай дысцыпліны абумоўлена спецыфікай функцыянавання бібліятэкі як гаспадарчага суб'екта, прымяненнем эканамічных падыходаў і форм ініцыятыўнага гаспадарання ў практыцы работы бібліятэк. Такі стан патрабуе не толькі адаптацыі сродкаў і метадаў інаватыкі да бібліятэчнай справы, але і пошуку ўласных падыходаў да вывучэння, здзяйснення інавацыйнай дзейнасці і кіравання зменамі ў бібліятэках.

Вучэбная дысцыпліна «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент» структуравана па раздзелах і тэмах, якія ўяўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца і спалучаецца з набытымі студэнтамі ведамі і ўменнямі пры вывучэнні дысцыплін цыкла агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін – «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю», «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія», «Бібліятэказнаўства» і абавязковых спецыяльных дысцыплін – «Інфармацыйныя рэсурсы», «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент».

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – засваенне студэнтамі тэарэтычных заканамернасцей развіцця бібліятэчнай інаватыкі, яе спецыфікі, асаблівасцей арганізацыі і ажыццяўлення важнейшых кірункаў практычнай інавацыйнай і навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– засвоіць веды па гісторыі станаўлення інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту ў кантэксце развіцця інфармацыйна-дакументных камунікацый і тэхналогій, сацыяльна-культурных змен у грамадстве;

– засвоіць веды па метадалогіі інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту: асноўныя падыходы, катэгорыі і ключавыя элементы; па агульных пытаннях арганізацыі бібліятэчнай інавацыйнай дзейнасці; засвоіць прынцыпы і спосабы кіравання інавацыйным працэсам і новаўвядзеннямі ў бібліятэках;

– сфарміраваць уменні прымяняць веды, якія тычацца інавацыйнай, навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк: авалоданне методыкай падрыхтоўкі арганізацыйна-распарадчай дакументацыі, метадычных выданняў, методыкамі правядзення метадычнага маніторынгу ў бібліятэках; сфарміраваць уменні прымяняць веды, якія тычацца збору, разліку адносных і сярэдніх велічынь, групоўкі і зводкі статыстычных даных, ажыццяўлення статыстычнага аналізу; планавання дзейнасці бібліятэк, правядзення кансультацый для супрацоўнікаў бібліятэк па найбольш актуальных пытаннях бібліятэчнай практыкі, ажыццяўлення аналізу і прагназавання дзейнасці бібліятэк;

– раскрыць патэнцыял інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту як інструмента кіравання інавацыйнымі працэсамі ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, як інструмента эфектыўнага аднаўлення і ўдасканалення прафесійнай дзейнасці;

– сфарміраваць аналітычную кампетэнцыю даследчыкаў, забяспечыць разуменне спецыфікі і значнасці інавацыйнай дзейнасці для развіцця і ўдасканалення бібліятэк;

– развіць здольнасці да пастаяннай самаадукацыі і эфектыўнай самарэалізацыі ў прафесіі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асновы тэорыі інавацый і інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту;

– тэарэтыка-метадалагічныя асновы кіравання інавацыйным працэсам у бібліятэцы;

– кірункі і прынцыпы навукова-метадычнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці бібліятэк;

– методыку ацэнкі эфектыўнасці інавацыйна-метадычнай дзейнасці бібліятэкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– выкарыстоўваць тэарэтычныя, арганізацыйна-метадычныя і тэхнолага-інавацыйныя веды ў прафесійнай практычнай і навуковай дзейнасці;

– карыстацца маркетынгавай стратэгіяй развіцця бібліятэкі для пашырэння наменклатуры інавацыйнай прадукцыі, засваення новых тэхналогій навуковай і інавацыйна-метадычнай вытворчасці;

– распрацоўваць мерапрыемствы павышэння эфектыўнасці інавацыйна-метадычнай дзейнасці бібліятэкі;

– выкарыстоўваць вопыт работы ўстаноў культуры ў галіне інавацыйна-метадычнай дзейнасці бібліятэк;

*валодаць:*

– навыкамі складання інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў па прыярытэтных кірунках інавацыйна-метадычнай дзейнасці;

– методыкамі распаўсюджвання інавацыйна-метадычнага вопыту.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі тэарэтычных, арганізацыйна-метадычных і тэхнолага-інавацыйных ведаў у галіне інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– метад праблемнага выкладання;

– метад дзелавой гульні;

– метад вывучэння нарматыўна-рэгламентуючых дакументаў.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент» па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент) павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам для вырашэння праблем.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

*Сацыяльна-культурная дзейнасць*

ПК-5. Весці бібліятэчнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў.

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.

*Інавацыйна-метадычная дзейнасць*

ПК-12. Вывучаць, аналізаваць і ўкараняць сусветны вопыт інавацыйнай дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю.

*Навукова-даследчая дзейнасць*

ПК-15. Выкарыстоўваць сучасныя дасягненні навукі і перадавых тэхналогій і ўкараняць іх у практычную дзейнасць.

*Вытворча-тэхналагічная дзейнасць*

ПК-23. Укараняць прынцыпы інавацыйнага менеджменту і сістэмы менеджменту якасці ў работу бібліятэкі.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент» выкарыстоўваюцца наступныя формы: аўдыторная і групавая.

Паспяховаму засваенню вучэбнай дысцыпліны спрыяе ўключэнне заданняў па дысцыпліне ў праграму вытворчай практыкі.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент» для напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент) усяго адведзена 144 гадзіны, з якіх 80 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 38 гадзін – лекцыі, 10 гадзін – семінары, 32 гадзіны – практычныя заняткі.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. | практ. зан. |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| **Раздзел І. Асновы бібліятэчнай інаватыкі** | | | | |
| *Тэма 1.* Інаватыка як навука пра інавацыі | 6 | 4 | 2 | |
| *Тэма 2.* Асноўныя кірункі інавацыйных змен у бібліятэцы | 4 | 4 | | |
| *Тэма 3.* Інавацыйны працэс у бібліятэцы | 18 | 4 | | 14 |
| *Тэма 4.* Інавацыйны менеджмент у бібліятэчнай сферы | 6 | 4 | 2 | |
| *Тэма 5.* Эфектыўнасць інавацый у бібліятэцы | 5 | 1 | | 4 |
| **Раздзел ІІ. Навукова-метадычная дзейнасць у сістэме інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту** | | | | |
| *Тэма 6.* Навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк: сутнасць і асноўныя напрамкі | 2 | 2 | | |
| *Тэма 7.* Навукова-інавацыйны патэнцыял аналітычнай дзейнасці бібліятэк. Метадычны маніторынг | 4 | 2 | | 2 |
| *Тэма 8.* Кансалтынгавае і інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне бібліятэчна-інфармацыйных устаноў | 4 | 2 | | 2 |
| *Тэма 9.* Дзейнасць метадычных цэнтраў па распаўсюджванні інавацыйнага вопыту | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 10.* Павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў як кірунак навукова-метадычнай дзейнасці | 4 | 2 | | 2 |
| **Раздзел ІІІ. Бібліятэчная статыстыка як сродак аналізу дзейнасці бібліятэк** | | | | |
| *Тэма 11.* Роля бібліятэчнай статыстыкі ў забеспячэнні інавацыйнага развіцця бібліятэк | 4 | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 12*. Стандартызацыя бібліятэчнай статыстыкі | 2 | 2 | | |
| *Тэма 13*. Паказчыкі бібліятэчнай статыстыкі: збор, разлік, аналіз | 10 | 2 | | 8 |
| *Тэма 14*. Этапы статыстычнага даследавання | 2 | 2 | | |
| *Тэма 15*. Вымярэнне эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк і бібліятэчная статыстыка. Замежныя методыкі ацэнкі дзейнасці бібліятэк | 4 | 2 | 2 | |
| **Разам…** | **80** | **38** | **10** | **32** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

***Уводзіны***

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Практычная накіраванасць вучэбнай дысцыпліны. Вывучэнне інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту як умова гарманічнага развіцця бібліятэк і ўдасканалення іх практычнай дзейнасці. Веды, уменні, вопыт, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Яе ўзаемасувязі з іншымі спецыяльнымі прадметамі інфармацыйна-дакументнага цыкла. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці вучэбнай дысцыпліны вучэбна-метадычнай дакументацыяй.

## Раздзел I. Асновы бібліятэчнай інаватыкі

*Тэма 1. Інаватыка як навука пра інавацыі*

Абгрунтаванне значнасці інавацый для развіцця грамадства. Уклад інавацый як формы навукова-тэхнічнага прагрэсу ў эканамічнае, культурнае і сацыяльнае развіццё грамадства. Айчынныя і сусветныя тэндэнцыі інавацыйнага развіцця. Спецыфіка інавацый у эканоміцы, сацыяльнай і культурнай сферы.

Станаўленне і эвалюцыя інаватыкі. Задачы інаватыкі ў сучасным грамадстве.

Асноўныя нарматыўныя дакументы, якія рэгулююць працэс інавацыйнага развіцця і ўкаранення інавацый.

Падыходы да вызначэння інавацый, класічныя вызначэнні, новыя вызначэнні. Спецыфіка тэрмінаў «інавацыя», «навізна», «новаўвядзенне». Тэрміны, якія характарызуюць інавацыйную дзейнасць. Спецыфіка разумення гэтых тэрмінаў у эканоміцы, сацыяльнай і культурнай сферы.

Метадалагічныя падыходы да інаватыкі. Сістэмна-дзейная канцэпцыя інавацый. Маркетынгавая канцэпцыя інавацый.

Групоўка інавацый, яе значэнне. Класіфікацыя інавацый па розных прыкметах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2. Асноўныя кірункі інавацыйных змен у бібліятэцы*

Фактары і ўмовы ўкаранення інавацый у дзейнасць бібліятэк. Інавацыйная дзейнасць бібліятэк у кантэксце новай грамадскай рэальнасці. Інавацыйная палітыка ў стратэгічным кіраванні бібліятэкай. Змест бібліятэчнай інаватыкі, яе мэты.

Змены зместу, форм, метадаў дзейнасці бібліятэк у кантэксце ўкаранення інавацый. Асноўныя сферы ўкаранення інавацый у дзейнасць бібліятэк: сацыяльная, арганізацыйна-кіраўнічая, змястоўна-дзейнасная, тэхналагічная, фінансава-эканамічная. Класіфікацыя бібліятэчных інавацый. Існуючыя падыходы да класіфікацыі інавацый у бібліятэчнай справе.

*Тэма 3. Інавацыйны працэс у бібліятэцы*

Змест і структура інавацыйнага працэсу ў бібліятэцы. Этапы інавацыйнага працэсу: інавацыя; вывучэнне бібліятэчнай практыкі; пошук, выяўленне і вывучэнне навін; стварэнне навін.

Інавацыйная заяўка: сутнасць і складаючыя элементы. Інавацыйная прапанова: сутнасць і складаючыя элементы. Асаблівасці рынку інавацыйных прапаноў у навукова-тэхнічнай і сацыяльнай сферах. Структура інавацыйнай заяўкі і інавацыйнай прапановы.

Інавацыйны праект у бібліятэцы: віды, распрацоўка. Праектная работа як цыкл работ: этапы здзяйснення. Інавацыйны праект – прызначэнне, характарыстыка, структура і асаблівасці складання і выкарыстання. Інавацыйны праект як дакумент знешняга інфармавання і ўнутранага выкарыстання. Экспертыза інавацыйных праектаў бібліятэкі. Фарміраванне праектных груп і асаблівасці работы бібліятэчнага персаналу ў праектных групах.

*Тэма 4. Інавацыйны менеджмент у бібліятэчнай сферы*

Навуковыя канцэпцыі інавацыйнага менеджменту. Мэты і змест стратэгічнага кіравання зменамі. Трансфармацыя місіі бібліятэкі ў адпаведнасці з патрабаваннямі асяроддзя.

Інавацыйная палітыка ў стратэгічным кіраванні бібліятэкай. Задачы і этапы стратэгічнага планавання дзейнасці бібліятэк. Стратэгічны план, мэтавыя праграмы развіцця і інавацыйныя праекты як дакументы, якія вызначаюць інавацыйную палітыку бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маркетынг у стратэгічным кіраванні і рэалізацыі інавацыйнай палітыкі. Маркетынгавыя даследаванні і бібліятэчныя інавацыі. Сутнасць і функцыі планавання інавацый. Метады планавання: навукова-тэхнічнае прагназаванне, каштарысна-нарматыўны і інш.

Сутнасць і змест інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту. Этапы (падыходы) станаўлення і развіцця інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту: фактарны, функцыянальны, сістэмны і сітуацыйны.

Задачы і функцыі (прадметныя, працэсуальныя, сацыяльна-псіхалагічныя) інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту.

Сутнасць і асноўныя прыёмы інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту. Арганізацыя работ па распаўсюджванні і прасоўванні навін. Попыт і прапанова на рынку навін.

Прыёмы, якія ўплываюць толькі на вытворчасць інавацый у бібліятэцы: спосабы маркетынгавага ўплыву на інавацыі; бенчмаркетынг як спосаб вывучэння дзейнасці канкурэнтаў з мэтай выкарыстання іх вопыту.

Прыёмы, якія ўздзейнічаюць толькі на рэалізацыю, прасоўванне і дыфузію інавацый: коштавы прыём кіравання; франтаванне рынку.

Прыёмы, якія ўздзейнічаюць як на вытворчасць, так і на рэалізацыю, прасоўванне і дыфузію інавацый; інжынірынг інавацый; брэнд-стратэгія інавацыі.

Кантроль у інавацыйным бібліятэчным менеджменце – віды, мэты, формы кантролю; улік, справаздачнасць і аналіз у інавацыйным бібліятэчным менеджменце.

### *Тэма 5. Эфектыўнасць інавацый у бібліятэцы*

Ацэнка эфектыўнасці інавацый. Змест паняццяў «эфект» і «эфектыўнасць». Віды эфекту інавацый. Метады ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці інавацыйных праектаў: экспертныя меркаванні, мнагамерныя крытэрыі адзнак: прывабнасць галіны, магчымасці пранікнення ў яе канкурэнтаў, уплыў на канкурэнтаздольнасць новага прадукту/паслугі ў цэлым, магчымасці выкарыстання распрацовак для ўдасканалення ўжо створаных прадуктаў/паслуг, уплыў вытворчасці і збыту новага прадукту/паслугі на фінансавы стан бібліятэкі.

Прыклады разліку паказчыкаў дзейнасці інавацыйнай установы: эфектыўнасць навіны і механізмы яе інвесціравання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Навукова-метадычная дзейнасць у сістэме інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту

### *Тэма 6. Навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк: сутнасць і асноўныя напрамкі*

Узаемасувязь інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту і навукова-метадычнай дзейнасці бібліятэк. Навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк: азначэнне паняцця, асноўныя мэты і задачы на сучасным этапе. Узроўні навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.

Асноўныя прынцыпы навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк: навуковасць, актыўнасць, рэкамендацыйнасць, дыферэнцыраваны падыход, непасрэдная сувязь з бібліятэкамі, аператыўнасць, сістэматычнасць і планавасць.

Функцыі навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэчнай дзейнасці: інфармацыйная, педагагічная, арганізацыйная, навукова-даследчая. Узаемасувязь навукова-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасці.

Асноўныя кірункі навукова-метадычнага забеспячэння: аналітычная дзейнасць, кансультатыўна-метадычная дзейнасць, дзейнасць па фарміраванні і садзейнічанні засваення бібліятэчных новаўвядзенняў, павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў.

Дыскусійныя пытанні метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк у сучасных умовах.

### *Тэма 7. Навукова-інавацыйны патэнцыял аналітычнай дзейнасці бібліятэк. Метадычны маніторынг*

Метадычны маніторынг як сістэма назірання за зменамі ў дзейнасці бібліятэк. Вызначэнне паняцця «метадычны маніторынг». Яго аб’екты  і асноўныя крыніцы інфармацыі. Акумуліраванне звестак у сістэме метадычнага маніторынгу. Інфармацыйна-пошукавы апарат метадычнага маніторынгу.

Абследаванне дзейнасці бібліятэк як асноўны метад атрымання інфармацыі для яго наступнага аналізу. Асноўныя метады абследавання бібліятэк: непасрэднае назіранне, вывучэнне дакументаў, гутаркі з бібліятэчнымі супрацоўнікамі і карыстальнікамі, метад анкетнага апытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віды абследавання бібліятэк. Мэты і аб’екты франтальнага і тэматычнага абследаванняў. Этапы правядзення абследавання. Методыка абследавання бібліятэк.

Аналіз бібліятэчнай практыкі: аналіз зместу дзейнасці бібліятэк, аналіз метадаў і вынікаў работы. Колькасны і якасны аналіз, іх асноўныя метады.

Сістэматызацыя фактычнага матэрыялу. Выніковыя дакументы аналітычнай дзейнасці: статыстычныя зводкі, заключэнні па справаздачах і планах бібліятэк, агляды дзейнасці бібліятэк. Методыка складання аглядаў дзейнасці бібліятэк. Выкарыстанне вынікаў аналітычнай дзейнасці ў метадычным забеспячэнні работы бібліятэк і ва ўдасканаленні функцыянавання бібліятэкі як сацыяльнага інстытута.

### *Тэма 8. Кансалтынгавае і інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне бібліятэчна-інфармацыйных устаноў*

Кансалтынгавая і інфармацыйна-метадычная дапамога бібліятэкарам як традыцыйныя формы навукова-метадычнага кансультавання. Асноўныя патрабаванні да навукова-метадычнага кансультавання. Формы навукова-метадычнага кансультавання.

Падрыхтоўка, выданне і распаўсюджванне метадычных выданняў як асноўны шлях актыўнага кансультатыўна-метадычнага ўздзеяння. Сістэма метадычных выданняў для бібліятэк, асноўныя віды і групы: метадычныя дапаможнікі; інструктыўна-метадычныя дапаможнікі; вучэбна-метадычныя дапаможнікі; інфармацыйныя дапаможнікі; апісанні бібліятэчных наваўвядзенняў; бібліяграфічныя дапаможнікі ў дапамогу бібліятэкару; метадычныя выданні комплекснага характару.

Патрабаванні да зместу і складу метадычных выданняў. Вывучэнне эфектыўнасці выкарыстання метадычных рэкамендацый і інш.

### *Тэма 9. Дзейнасць метадычных цэнтраў па распаўсюджванні інавацыйнага вопыту*

Інавацыйная дзейнасць у бібліятэках, яе сутнасць і змест. Сутнасныя адрозненні тэрмінаў «інавацыя» і «новаўвядзенне». Мэта інавацыйнай дзейнасці бібліятэк. Асноўныя класы новаўвядзенняў, характэрных для бібліятэчнай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вызначэнне паняцця «кіраванне новаўвядзеннямі». Кіраванне новаўвядзеннямі як эфектыўны сродак удасканалення дзейнасці бібліятэк. Прынцыпы, якія ляжаць у аснове кіравання новаўвядзеннямі.

Характарыстыка асноўных этапаў інавацыйнай дзейнасці метадычных цэнтраў бібліятэк: вывучэнне бібліятэчнай практыкі, выяўленне новаўвядзенняў альбо іх стварэнне з дапамогай эксперыментальных метадаў, вывучэнне і ацэнка новаўвядзення, укараненне новаўвядзення і дапамога бібліятэкам у яго засваенні, кантроль за засваеннем.

Інфармацыйнае забеспячэнне інавацыйнай дзейнасці. Інфармаванне аб новаўвядзеннях. Метады распаўсюджвання новаўвядзенняў.

### *Тэма 10. Павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў як кірунак навукова-метадычнай дзейнасці*

Павышэнне кваліфікацыі кадраў бібліятэкі як неабходная ўмова развіцця персаналу і ўдасканалення дзейнасці бібліятэкі. Патрабаванні да сістэмы павышэння кваліфікацыі: усеагульнасць, дыферэнцыраваны падыход, развіццё творчай ініцыятывы бібліятэкараў, сістэматычнасць і паслядоўнасць. Асноўныя напрамкі і формы павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў: курсы павышэння кваліфікацыі, навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, практыкумы, стажыроўкі.

Інавацыйныя метады і формы навучання ў сістэме павышэння кваліфікацыі бібліятэчных спецыялістаў. Самаадукацыя як важнейшая форма павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў. Удасканаленне сістэмы павышэння кваліфікацыі метадыстаў. Інфармацыйнае забеспячэнне сістэмы павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Бібліятэчная статыстыка як сродак аналізу дзейнасці бібліятэк

### *Тэма 11. Роля бібліятэчнай статыстыкі ў забеспячэнні інавацыйнага развіцця бібліятэк*

Бібліятэчная статыстыка: існуючыя пункты гледжання на азначэнне паняцця. Шырокае і вузкае разуменне бібліятэчнай статыстыкі. Аб’ект статыстычнага даследавання ў бібліятэчнай

статыстыцы: шырокае і вузкае разуменне. Прадмет бібліятэчнай статыстыкі. Агульная мэта бібліятэчнай статыстыкі, задачы бібліятэчнай статыстыкі.

Структура бібліятэчнай статыстыкі ў шырокім і вузкім сэнсах. Узроўні бібліятэчнай статыстыкі: іх агульная характарыстыка.

Суб'екты, якім патрэбна бібліятэчная статыстыка. Роля бібліятэчнай статыстыкі ў кіраванні бібліятэчнай справай краіны ўвогуле і асобнымі бібліятэкамі ў прыватнасці.

*Тэма 12. Стандартызацыя бібліятэчнай статыстыкі*

Сутнасць стандартызацыі і яе роля ў галіне бібліятэчнай статыстыкі. Узроўні стандартызацыі бібліятэчнай статыстыкі.

Дзейнасць IFLA і ISO ў галіне ўдасканалення паказчыкаў дзейнасці бібліятэк. Маніфест IFLA аб бібліятэчнай статыстыцы (2010). Асноўныя замежныя стандарты ў галіне бібліятэчнай статыстыкі, у тым ліку стандарт ISO 2789 : 2013 Інфармацыя і дакументацыя. Міжнародная бібліятэчная статыстыка, ISO 11620 : 2014 Інфармацыя і дакументацыя. Паказчыкі эфектыўнасці работы бібліятэк і інш.

Нацыянальны стандарт па бібліятэчнай статыстыцы Рэспублікі Беларусь СТБ 7.20-2000 Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні: агульная характарыстыка стандарту. Перспектывы ўдасканалення нацыянальнага бібліятэчнага стандарту.

*Тэма 13. Паказчыкі бібліятэчнай статыстыкі: збор, разлік, аналіз*

Статыстычныя паказчыкі: змест паняцця. Уліковая функцыя статыстычных паказчыкаў. Статыстычны паказчык як колькасная мадэль з'яў ці працэсаў дзейнасці бібліятэк. Статыстычныя паказчыкі і планаванне дзейнасці: роля статыстычных паказчыкаў у кіраванні бібліятэчнай дзейнасцю. Сістэма статыстычных паказчыкаў і яе характэрныя рысы. Адрозненні планавых і ўлікова-статыстычных паказчыкаў.

Асноўныя віды статыстычных паказчыкаў – абсалютныя, адносныя, сярэднія паказчыкі – змест паняццяў і агульная характарыстыка. Сутнасць абсалютных паказчыкаў. Тры асноўныя групы адносных паказчыкаў: паказчыкі дынамікі (каэфіцыент, тэмп росту, тэмп прыросту); паказчыкі структуры; паказчыкі інтэнсіўнасці. Віды сярэдніх паказчыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыклады кожнага віду паказчыкаў. Асаблівасці збору і вылічэння гэтых паказчыкаў.

Комплекс паказчыкаў афіцыйнай бібліятэчнай статыстыкі. Форма дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці ў Рэспубліцы Беларусь – форма 1-бібліятэка (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці публічнай бібліятэкі», яе агульная характарыстыка.

*Тэма 14. Этапы статыстычнага даследавання*

Змест паняцця «статыстычнае даследаванне». Этапы статыстычнага даследавання.

Статыстычнае назіранне: змест паняцця. Галоўная задача статыстычнага назірання. Даныя статыстычнага назірання як складаючая частка кіруючай інфармацыйнай сістэмы бібліятэкі, патрабаванні да іх. Праграма статыстычнага назірання: агульная характарыстыка. Падзел статыстычных назіранняў па спосабе арганізацыі, па ахопе адзінак сукупнасці, па часе правядзення, па крыніцах звестак. Агульная характарыстыка вылучаных відаў, арганізацыйных форм і спосабаў правядзення статыстычнага даследавання.

Групоўка і зводка матэрыялу: змест паняццяў і агульная характарыстыка. Паслядоўнасць выканання работ над данымі статыстычнага назірання пры групоўцы і зводцы статыстычных даных. Задачы групоўкі даных і адпаведныя задачам віды групоўкі (тыпалагічная, структурная, аналітычная). Упарадкаванне эмпірычных даных: сутнасць і прыёмы ўпарадкавання. Таблічнае прадстаўленне статыстычных даных як сродак упарадкавання эмпірычных даных. Графічнае адлюстраванне эмпірычных даных: сутнасць і прызначэнне. Зводка як этап упарадкавання і сістэматызацыі статыстычных даных.

Статыстычны аналіз як заключная стадыя статыстычнага даследавання: агульная характарыстыка. Задачы і парадак ажыццяўлення статыстычнага аналізу.

*Тэма 15. Вымярэнне эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк і бібліятэчная статыстыка. Замежныя методыкі ацэнкі дзейнасці бібліятэк*

Бібліятэчная статыстыка і вымярэнне эфектыўнасці работы: узаемасувязь і адрозненні. Замежны вопыт выкарыстання статыстычных паказчыкаў для ацэнкі эфектыўнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стандарт ISO 11620 : 2014 Інфармацыя і дакументацыя. Паказчыкі эфектыўнасці работы бібліятэк, агульная характарыстыка.

Вызначэнне паняцця «паказчык эфектыўнасці». Сутнасць і асноўныя ўласцівасці паказчыкаў эфектыўнасці. Паказчыкі дзейнасці бібліятэк як інструмент ацэнкі і супастаўлення вынікаў дзейнасці бібліятэк, вымярэння эфектыўнасці работы. Патрабаванні, якім павінны адпавядаць паказчыкі эфектыўнасці. Прыклады паказчыкаў эфектыўнасці бібліятэк.

Кірункі ўдасканалення паказчыкаў бібліятэчнай статыстыкі, паказчыкаў эфектыўнасці ў замежжы. Замежныя методыкі ацэнкі дзейнасці: Servqual, Libqual, Benchmarking і інш. Сутнасць гэтых методык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Басов, С.* Проблемы и перспективы перестройки методической работы: взгляд из 1988 года / С. Басов // Библиотечное дело. – 2010. – № 11 (125). – С. 2–7.

*2. Бачалдин, Б. Н.* «Менеджмент в научно-методической работе», отрывки / Б. Н. Бачалдин, Л. М. Инькова // Молодые в библиотечном деле. – 2014. – № 3. – С. 58–72.

*3.* Библиотечная статистика / М. Н. Колесникова // Менеджмент библиотечно-информационной деятельности: учебник для вузов / М. Н. Колесникова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2009. – С. 137–146.

*4.* Библиотечная статистика / И. М. Суслова // Менеджмент библиотечно-информационной деятельности : учебник для вузов культуры и искусств / И. М. Суслова, В. М. Клюев ; под общ. ред. И. М. Сусловой ; МГУКИ. – СПб. : Профессия, 2009. – С. 373–387.

*5. Бородина, В. А.* Информационное обслуживание: описание, таблицы для методиста / В. А. Бородина. – М. : Либерея-Бибинформ, 2013. – 79 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век» ; вып. 144).

*6. Ванеев, А. Н.* Методическое обеспечение библиотечной деятельности : учеб. пособие / А. Н. Ванеев ; СПбГУКИ. – М., 2002. – 140 с. – (Серия «Современная библиотека» ; вып. 10).

*7. Гусева, Е. Н.* Инновации в библиотеке : сб. ст. / сост. : М. Я. Дворкина, Е. Н. Гусева. – М. : Пашков дом, 2010. – 132 с.

*8. Гусева, Е. Н.* Инновационное развитие библиотечно-информационной сферы / Е. Н. Гусева // Науч. и техн. б-ки. – 2009. – № 11. – С. 7–15.

*9. Гусева, Е. Н.* Управление инновациями в библиотечной сфере. Особенности, факторы, условия / Е. Н. Гусева // Информ. бюллетень РБА. – 2009. – № 53. – С. 7–9.

*10. Долгополова, Е.* Статистический учет и оценка эффективности обслуживания пользователей / Е. Долгополова // Бібліятэчны свет. – 2008. – № 3. – С. 12–18.

*11. Качанова, Е. Ю.* Инновационно-методическая работа библиотек : учеб. пособие / Е. Ю. Качанова ; науч. ред. А. Н. Ванеев ; ХГИИК. – СПб. : Профессия, 2007. – С. 193–201.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Клюев, В. К.* Менеджмент ресурсного потенциала библиотеки : учеб.-метод. пособие / В. К. Клюев. – М. : Литера, 2011. – 112 с.

*13. Красильникова, И. Ю.* Инновационный вектор развития взаимного использования библиотечных ресурсов / И. Ю. Красильникова // Информ. бюллетень РБА. – 2012. – № 65. – С. 102–105.

*14. Матлина, С.* Об инновациях без восторгов и оваций / С. Матлина // Библиотечное дело. – 2008. – № 6. – С. 2–10.

*15. Меньщикова, С. П.* Современные критерии и показатели оценки качества библиотечной деятельности: практ. пособие / С. П. Меньщикова. – М. : Литера, 2009. – 93 с. – (Серия «Современная библиотека» ; вып. 48).

*16.* Мобильные библиотеки. Мобильные библиотечные онлайновые услуги : сб. публ. / под ред. Дж. Нидхем, М. Элли ; науч. ред. д-р техн. наук, проф. Я. Л. Шрайберг ; пер. Е. В. Малявская, В. В. Зверевич. – СПб. : Профессия, 2012. – 368 с.

*17.* Научно-методическое обеспечение библиотечно-информационной деятельности / И. М. Суслова // Менеджмент библиотечно-информационной деятельности : учебник для вузов культуры и искусств / И. М. Суслова, В. М. Клюев ; под общ. ред. И. М. Сусловой ; МГУКИ. – СПб. : Профессия, 2009. – С. 337–359.

*18. Ратникова, О. Л.* Организационно-технологические проблемы взаимодействия инновационной и методической деятельности / О. Л. Ратникова // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. / Рос. гос. б-ка. – М., 2003. – Вып. 2(6). – С. 286–300. – (Прил. к журн. «Библиотековедение»).

*19.* СТБ 7.20-2000. Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні = Библиотечная статистика. Основные положения. – Введ. 01.09.2000. – Мінск : Дзяржстандарт, б. г. [2000]. – 6 с. – (Сістэма стандартаў па інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справе).

*Дадатковая*

*1. Бражникова, С.* Четко выверенная стратегия. Научно-методическая работа / С. Бражникова // Библиотечное дело. – 2015. – № 16. – С. 22–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Брежнева, В. В.* Информационное обслуживание : учеб. пособие / В. В. Брежнева, Р. С. Гиляревский. – СПб. : Профессия, 2012. – 368 с. – (Библиотека).

3. Веб 2.0, библиотеки и информационная грамотность : сб. публ. / под ред. П. Годвина, Дж. Паркера. – СПб. : Профессия, 2011. – 238 с.

4. *Голубенко, Н. Б.* Библиотечное дело: инновации и перспективы / Н. Б. Голубенко. – М. : Логос, 2014. – 125 с.

5. *Гузнер, С. С.* Адаптация библиотек: подходы, методы, модели, практика : науч.-метод. пособие / С. С. Гузнер, Л. А. Кожевникова, О. В. Макеева. – М. : Либерея-Бибинформ, 2013. – 159 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век» ; вып. 145).

6. *Гусева, Е. Н.* Инновационное развитие библиотечно-информационной сферы страны на современном этапе / Е. Н. Гусева // Библиотечное дело – XXI век. – 2008. – № 2. – С. 24–45.

7. *Дворкина, М. Я.* Как долго длится инновация? / М. Я. Дворкина // Библиосфера. – 2009. – № 4. – С. 15–18.

8. *Качанова, Е. Ю.* Инновации в библиотеках / Е. Ю. Качанова. – СПб. : Профессия, 2003. – 317 с.

9. *Клюев, В. К.* Маркетинговая парадигма современных публичных библиотек / В. К. Клюев // Библиотечное дело. – 2015. – № 3. – С. 14–19.

10. *Кувшинова, М.* Управление изменениями. Научно-методическая деятельность центральной библиотеки региона / М. Кувшинова // Библиотечное дело. – 2014. – № 23. – С. 32–36.

11. *Пол, Р.* Измерение качества деятельности библиотек / Розвитта Пол, Питер те Бокхорст / Рос. гос. б-ка ; пер. с англ. и науч. ред. Г. А. Кисловской. – Стер. переизд. – М. : Пашков дом, 2010. – 316 с.

12. *Сидорин, В. В.* Маркетинг – нечуждое понятие для современной библиотеки / В. В. Сидорин // Библиотечное дело. – 2015. – № 3. – С. 20–22.

13. *Смирнова, О. Е.* Самооценка деятельности как основа эффективного управления библиотекой / О. Е. Смирнова, С. А. Тарасова, З. М. Саенко // Библиосфера. – 2015. – № 4. – С. 28–33.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Соколов, А. В.* Библиотечная маркетология как библиотековедческая дисциплина / А. В. Соколов // Библиотечное дело. – 2015. – № 3. – С. 2–9.

*15. Чаднова, И. В.* Методическое обеспечение деятельности российских библиотек по обслуживанию мультикультурного населения / И. В. Чаднова // Информ. бюллетень РБА. – 2014. – № 69. – С. 116–119.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;

– падрыхтоўка і правядзенне пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах;

– залік;

– экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і экзаменаў.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па раздзелах: «Асновы бібліятэчнай інаватыкі», «Навукова-метадычная дзейнасць у сістэме інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту», «Бібліятэчная статыстыка як сродак аналізу дзейнасці бібліятэк» па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па курсе.

## Формы выканання самастойнай работы:

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі).

## Прыкладныя тэмы для самастойнай работы

*Раздзел I. Асновы бібліятэчнай інаватыкі*

1. Асноўныя кірункі інавацыйнай мадэрнізацыі бібліятэчнай галіны.
2. Праблемы і прыклады інавацыйнай дзейнасці бібліятэк (айчынны і замежны вопыт).
3. Сацыяльныя аспекты інавацыйнай дзейнасці.
4. Прычыны антыінавацыйных паводзін і метады іх нейтралізацыі.

*Раздзел II. Навукова-метадычная дзейнасць у сістэме інавацыйнага бібліятэчнага менеджменту*

5. Дыскусійныя пытанні метадычнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.
6. Метадычны маніторынг як сістэма бесперапыннага назірання за функцыянаваннем бібліятэкі і яе асобных падраздзяленняў.
7. Метадычныя дапаможнікі ў дапамогу дзейнасці бібліятэк.
8. Кіраванне інавацыйнымі працэсамі ў бібліятэках.

*Раздзел III. Бібліятэчная статыстыка як сродак аналізу дзейнасці бібліятэк*

9. Паказчыкі эфектыўнасці работы бібліятэк.
10. Стандарты ў галіне бібліятэчнай статыстыкі (параўнальны аналіз).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ІНАВАЦЫЙНЫ БІБЛІЯТЭЧНЫ МЕНЕДЖМЕНТ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60х84 1/16.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,89. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2016.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2016.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.